Пры вызначэнні асновы ў неазначальнай форме дзеяслова ў яе не ўключаюцца суфіксы *-ць, -ці, -чы*: *спяваць, везці, бегчы*. Не ўваходзяць у аснову дзеяслова і суфіксы прошлага часу *-л-* і *-ў-*: *радаваў*□, *думаў*□; *малявала, перадавала*.

**63.** Адгадайце загадкі А. Клышкі. Запішыце загадкі разам з адгадкамі.



Просяцца на вусначкі
Акрайчыкі, **скібачкі**, лустачкі*.



**Пчаліная** справа.
Мядзведжая страва.



Благі з яго **нырэц**.
**Скочыў** у ваду —
Тут і канец.

Вызначце ў выдзеленых словах асновы і канчаткі. Параўнайце карані і асновы ў словах-адгадках.



**64.** Спішыце прыказкі, устаўляючы прапушчаныя канчаткі ў словах. Вызначце ў гэтых словах асновы. Назавіце словы з нулявым канчаткам.

1. Пакармі птушак зімой — яны аддзяч.. вясной. 2. Плач.. хлеб, калі яго есць[ф] дармаед. 3. Лён люб.. паклон. 4. Ён пройдз.. па вадзе і не намочыцца. 5. Чмель гудзе, але мёду не нос.. .

Якія прыказкі можна аб'яднаць у тэму «Праца»? Абгрунтуйце свой адказ.

## § 12. Корань слова (паўтарэнне). Аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго слова

**65.** Дапоўніце звесткі пра корань. Праілюструйце правіла ўласнымі прыкладамі.

Словы з аднолькавым па значэнні коранем называюць __________, ці ____________: …

Корань — агульная частка ________ слоў: …



Разгледзьце малюнак. Якой тэме ён прысвечаны? Як вы разумееце выраз *дрэва жывіцца карэннем*?






Правообладатель Национальный институт образования

**66.** Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку. Што з'яўляецца святам для гаспадароў?

Гасцёўня*, гасціннасць і госці —
У словах ёсць роднае штосьці.
Гасцёўня збірае гасцей:
Гасцюйце ў нас як часцей!
Гасцёўня гасцямі багата.
Вітаць вас — для нас гэта свята.

*В. Жуковіч.*

Выпішыце аднакаранёвыя словы. Вызначце ў іх корань. Абгрунтуйце напісанне арфаграмы «Правапіс ***о, э, а***».

Растлумачце значэнне слова *гасцёўня* праз падбор аднакаранёвых. Якая якасць беларусаў перададзена ў прыказцы «Госць на двор — пірагі на стол»?

**67.** Прачытайце тэкст. На колькі сэнсавых частак яго можна падзяліць? Пра якую сястру расказвае аўтар тэксту?

Друйка — імклівая сястра Бра́слаўскіх азёр. Выцякае рака з вялікага вадаёма Дрывяты, на беразе якога месціцца горад Бра́слаў. Праз азёры, палі і пералескі[с] нясе свае воды Друйка праз Бра́слаўшчыну да Заходняй Дзвіны[ф]. Там, дзе злучаюцца дзве ракі, раскінулася вялікае старажытнае паселішча — Друя. На беларускай зямлі нямала гарадоў і іншых паселішчаў, назвы якіх нарадзіліся ад назваў рэк. Назва горада Полацка паходзіць ад *(П/п)*алаты, Пінска — ад *(П/п)*іны, Беразіно — ад *(Б/б)*ярэзіны *(Паводле С. Гук)*.

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы да назоўніка *Браслаў.* Растлумачце іх значэнні. Назавіце іншыя групы аднакаранёвых слоў.

Спішыце апошні сказ, раскрываючы дужкі. Вызначце асновы і канчаткі ў словах.

**Корань** — галоўная значымая частка слова: ***горад*** — ***гарадскі*** — ***гарадок***.

У аснове заключаецца асноўнае значэнне слова, а ў корані — агульнае лексічнае значэнне роднасных слоў: ***рака,***


Правообладатель Национальный институт образования

*рачны, зарэчны*. Роднаснымі могуць быць словы адной (*лес*□, *лясок*□, *пералесак*□) і розных часцін мовы (*сад*□, *садовы*, *пасадзіць*).

**68.** Назавіце «чацвёртае лішняе» ў кожным радзе. Запішыце рады аднакаранёвых слоў. Вызначце ў іх карані. Раскажыце пра змены ў каранях.

1. Зубр, зубрыны, зубрыць, зубраня.
2. Дзень, днець, дзённы, дно.
3. Кніга, кніжны, кнігаўка, кніжка.

Растлумачце значэнне слова *зубрыць*.

**69.** Прачытайце і адгадайце загадку. Чаму тэкст мае такую назву? Растлумачце значэнне слова *руплівіца* праз падбор аднакаранёвых.



**Руплівіца**

Вёрткая кабета[л]
Працавала лета.
Не мяла,
Не шыла.
Грыбоў насушыла.
Не мыла,
Не прала.
Арэхаў набрала.
Не малола,
Не мясіла.
Гару шышак нанасіла.
Не піла,
Не ела.
Да зімы паспела.

*Н. Сторажава.*

Якія словы з тэксту маюць амонімы? Запішыце амонімы парамі. Вызначце ў іх карані.

**70.** «Апраніце» корань. Далучыце да кораня суфіксы і прыстаўкі. Звярніце ўвагу, што пры ўтварэнні роднасных слоў у корані могуць адбывацца змены.

-вод-, -рэч-, -бяроз-, -горад-, -азёр-.

Складзіце з двума запісанымі словамі словазлучэнні.



Правообладатель Национальный институт образования

**71.** Прачытайце табліцу. У якой графе запісаны аднакаранёвыя словы, а ў якой — формы аднаго і таго слова? Дайце назвы графам табліцы.

| … | … |
|---|---|
| *дрэва*<br>*дрэву*<br>*дрэвам*<br>*на дрэве* | *дрэва*<br>*дрэўца*<br>*дрэўка*<br>*драўляны* |

Складзіце невялікі тэкст са словамі першай графы.

**Формы слова** ўтвараюцца пры яго **змяненні** (скланенні ці спражэнні): *свет*[*у*], *у свец*[*е*], *свет*[*ам*]; *вяз*[*у*], *вяз*[*еш*], *вяз*[*уць*].

**Аднакаранёвыя словы** з'яўляюцца ў выніку ўтварэння новых слоў: *бабёр — бабраня; лётаць — лётчык — лётчыца*. Аднакаранёвыя словы маюць розныя значэнні.

**72.** Прачытайце тэкст. У якой краіне ўзнікла выцінанка? Ці можна яе назваць відам народнай творчасці?



*выціна́нка*

Мастацтва вырабу ажурных узораў з белай, чорнай ці каляровай[с] паперы называецца *выцінанкай** або *выразанкай*. Назва *выцінанка* паходзіць ад слова *выцінаць* — 'выразаць штонебудзь з паперы ці іншага матэрыялу'.

Выцінанка ўзнікла ў Кітаі. У Беларусі мастацтва выразання з паперы з'явілася ў XVI стагоддзі.

Важная асаблівасць выразанак з паперы — сіметрыя[л]. Самі ўзоры ч..сцей ге..метрычныя раслінныя. Але нярэ..ка б..ларускія майстры выразаюць і фігуры жывёл людзей *(Паводле «Вясёлкі»)*.

Выпішыце ў асобныя групы аднакаранёвыя словы да назоўніка *выразанка* і формы гэтага слова.

Ці з'яўляюцца словы *выцінанка* і *выразанка* аднакаранёвымі? Чым адрозніваюцца аднакаранёвыя словы ад сінонімаў?

Спішыце апошні абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і ставячы знакі прыпынку.

Разгледзьце малюнак выцінанкі. Што на ім адлюстравана? Да слоў *зубр* і *бусел* падбярыце аднакаранёвыя словы.



Правообладатель Национальный институт образования

***Звярніце ўвагу!***

Мова ўвесь час знаходзіцца ў развіцці. Словы могуць набываць іншае значэнне, знікаць з ужывання, змяняць сваю марфемную будову. Напрыклад, сёння словы *сталіц*[*а*], *народ*[ ], *гасцінец*[ ], *перамог*[*а*] падзяляюцца толькі на корань і канчатак. Раней у іх вылучаліся карані *стал*-, -*род*-, *гасц*-, -*мог*-.

**73.** Прачытайце тэкст. Як даўней называлі лекараў і ратавальнікаў?

Словы *веды* і *ведзьма* ў старажытнасці мелі аднолькавы корань. Роднасным для іх з'яўлялася слова *ведаць*. Сёння корань слова *ведзьма* супадае з асновай — *ведзьм*а. Раней ведзьмамі называлі лекараў і ратавальнікаў. Яны валодалі глыбокімі ведамі, імкнуліся, каб іх племя не зведала бяды і нястачы *(Паводле З. Дудзюк)*.

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы да слова *веды* і абазначце ў іх корань. Якія змены адбыліся ў корані пры ўтварэнні роднасных слоў? У якіх формах слова *веды* сустракаецца ў тэксце?

Знайдзіце ў тэксце апорныя словы. Перакажыце тэкст па апорных словах.

**74.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх сэнсавымі характарыстыкамі. Запішыце фразеалагізмы, раскрываючы дужкі.

1) глядзець у *(корань)*;
2) пусціць *(корань)*;
3) вырваць з *(корань)*.

а) 'трывала, надоўга абаснавацца дзе-небудзь, абзавесціся гаспадаркай';
б) 'унікаць у сутнасць якой-небудзь справы';
в) 'зусім, канчаткова пазбавіцца ад чаго-небудзь'.

Вызначце корань у формах слова *корань*. Якія змены ў ім адбыліся пры змяненні слова?



Правообладатель Национальный институт образования